# ВОДГУК

дацэнта кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, кандыдата гістарычных навук,
дацэнта Горнага Аляксандра Сяргеевіча,
навуковага кіраўніка Ананька Кірыла Дзмітрыевіча,
суіскальніка вучонай ступені кандыдата гістарычных навук

Ананька Кірыл Дзмітрыевіч у 2020 годзе скончыў з адзнакай факультэт гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ імя Я. Купалы па спецыяльнасці "Гісторыя (па накірунках)". У 2021 г. суіскальнік скончыў магістратуру ГрДУ імя Я. Купалы і паспяхова абараніў магістарскую дысертацыю. У 2021–2024 гадах навучаўся на дзённым аддзяленні аспірантуры ГрДУ імя Я. Купалы і выконваў дысертацыйнае даследаванне па тэме "Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)". За актыўную навукова-даследчыцкую дзейнасць узнагароджаны дыпломамі і імянымі стыпендыямі.

У 2024 годзе суіскальнік стаў пераможцам конкурса на прызначэнне стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аспірантам. У гэтым жа годзе атрымаў грант БРФФД "Мой першы грант" па тэме "Беларускія гімназіі ў міжваенны перыяд: грамадска-палітычны і культурны аспекты".

Дысертацыйнае даследаванне Ананькі К.Д. прысвечана вывучэню праблемы функцыянавання беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Актуальнасць тэматыкі дысертацыі не выклікае сумненняў, паколькі вывучэнне дзейнасці беларускіх гімназій з'яўляецца часткай комплекснага даследавання як гісторыі фарміравання беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнага руху, так і палітыкі польскага ўраду ў Заходняй Беларусі. Правядзенне такіх даследаванняў дыктуецца не толькі неабходнасцю назапашвання і аналізу інфармацыі, але і з'яўляецца вельмі важным для разумення сучасных змен геапалітычнага асяроддзя і асаблівасцей нацыянальных працэсаў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе.

У сваім даследаванні суіскальнік фактычна ўпершыню ў айчынай гістарыяграфіі даў абгрунтаванне беларускіх гімназій як устаноў па захаванню нацыянальнай самасвядомасці беларусаў ва ўмовах палітыкі паланізацыі, распрацаваў навуковую перыядызацыю іх дзейнасці. Малады даследчык раскрыў грамадска-палітычныя ўмовы ўтварэння беларускіх сярэдніх навучальных устаноў і іх прававое становішча, выявіў праекты стварэння сярэдніх беларускіх школ у розных рэгіёнах Заходняй Беларусі, якія раней у айчыннай гістарыяграфіі не згадваліся. Асаблівая ўвага была звернута на ролю педагогаў і навучэнцаў гімназій ў захаванні нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў. У даследаванні Ананькі К.Д. упершыню прааналізавана спецыфіка беларускіх гімназій як аднаго з цэнтраў нацыянальна-культурнага жыцця на тэрыторыі заходнебеларускага рэгіёна ў міжваенны час ва ўмовах ажыццяўлення польскімі ўладамі палітыкі нацыянальнай асіміляцыі, што яшчэ раз падкрэслівае гістарыяграфічную навізну даследуемай тэматыкі.

Заслугоўвае павагі глыбокае вывучэнне суіскальнікам гістарыяграфіі па праблеме даследавання. Ананька К.Д. правёў значную працу па выяўленню і вывучэнню дакументальных крыніц у архівах, бібліятэках і музеях Беларусі і замежжа. Асаблівай заслугай можна вылучыць увядзенне ў навуковы зварот новых дакументаў, што дазваляе прасачыць раней маладаследаваныя аспекты гісторыі Заходняй Беларусі міжваеннага перыяду. Неабходна заўважыць, што суіскальнік выкарыстоўвае ў сваім даследаванні сучасныя падыходы ў метадалогіі гісторыі, разглядаючы, напрыклад дзейнасць беларускіх гімназій праз прызму прасапаграфічнага метада.

Вынікі дысертацыйнага даследавання аспіранта апублікаваны ў 22 навуковых публікацый, у тым ліку у 9 артыкулах у рэцэнзаваных выданнях са спісу ВАК Беларусі, 13 публікацыях у зборніках артыкулаў і матэрыялаў канферэнцый. Навуковыя напрацоўкі суіскальніка могуць быць выкарыстаны для далейшай распрацоўкі праблемы дзейнасці беларускіх нацыянальных арганізацый у міжваеннай Польшчы, у навучальных дапаможніках, лекцыйных і спецыяльных курсах пры выкладанні дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла ў сістэме вышэйшай і сярэдняй адукацыі. Вынікі даследавання укаранены ў вучэбны працэс на факультэце гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ імя Янкі Купалы.

Дысертацыя Ананькі К.Д. адпавядае спецыяльнасці “07.00.02 – айчынная гісторыя”.

Ананька Кірылу Дзмітрыевічу можа быць прысуджана вучоная ступень кандыдата гістарычных навук за наступныя атрыманыя вынікі:

1. Вызначэнне перыядаў дзейнасці беларускіх гімназій у міжваеннай Заходняй Беларусі і іх характарыстыку.
2. Выяўленне сацыяльнага, канфесійнага і нацыянальнага склада вучняў і прафесійнага ўзроўня педагагічных калектываў беларускіх гімназій.
3. Раскрыццё уплыву грамадска-палітычных працэсаў у міжваеннай Заходняй Беларусі на стан і ўнутранае жыццё беларускіх гімназій.
4. Вызначэнне спецыфікі беларускіх гімназій як аднаго з цэнтраў нацыянальна-культурнага жыцця ў Заходняй Беларусі.

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі
і спецыяльных гістарычных дысцыплін
ГрДУ імя Янкі Купалы А.С. Горны

ПОДПИСЬ УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник отдела управления персоналом
учреждения образования «Гродненский
государственный университет имени Янки Купалы»
Отдел управления персоналом
С.В. Нестерович
16. 04. 2025 г.